# Вёска Смаліца

Толькі ты мне і сілу, і веру даеш,
Родны край - маіх дум, маіх сноў прыцяжэнне.
Тут мой верш самы першы імкнуўся ў бязмеж,
Тут знаходзіла сэрца ад бед суцяшэнне.

Мая радзіма… Якая ж яна цудоўная! Я люблю яе за лясы, за яе бясконцыя палі, за яе шырокія далягляды і проста я яе люблю. І магу з гордасцю сказаць: “Вось гэта мая радзіма, тут я нарадзілася і вырасла”.

Не ўяўляю сябе асобна ад гэтых любімых мясцін. Цяжка гаварыць аб тым, што ты больш за ўсё любіш і да чаго прывыкла з дзяцінства. Пачнеш расказваць, і ўвесь час здаецца, што пра самае галоўнае забылася. Сапраўды, што можа быць бліжэй роднага дома, сцяжынкі ад варот, якая імкнецца ўдалечыню? Што яшчэ можа вызваць у глыбіні душы такую трывогу і пачуццё настальгіі ў час доўгай разлукі, як не родная старонка?

Менавіта такія пачуцці выклікае ў мяне мая вёска. Гэта і замілаванне, і захапленне, і радасць, пераплеценая з пяшчотай. Знешне мая вёска простая, нічым не адметная, са сваім паўсядзённым бытам. Чалавеку, які першы раз трапляе ў нашу Смаліцу, нічога не падасца тут цікавым. Але гэта далёка не так. Пажыўшы тут некаторы час, ён пачынае разумець, што вёска не простая. Свае адметнасці яна як быццам хавае і не хоча паказваць, а толькі палюбі яе, палічы сваёй, табе адразу ж адкрыюцца і пакажуцца ўсе яе цуды .

Цікавая гісторыя ўзнікнення назвы вёскі. На ўзвышшы, на пясчаных лясных глебах раслі прыгожыя велізарныя смалістыя сосны. А побач у вёсцы варылі смалу, здабываючы яе з гэтых соснаў. Спачатку называлі вёску Смольніца, а пасля назва спрасцілася, стала вёска называцца Смаліца. Як сведчаць архіўныя дакументы, якія захаваліся, дакладныя дакументальныя звесткі аб Смаліцы датуюцца аж 1846 годам. Вось які доўгі шлях прайшла мая вёска ад свайго нараджэння…

Ціхія, крывыя, галінастыя вясковыя вулачкі… Улетку яны проста патанаюць у зелені шматлікіх бяроз, ліп, клёнаў… Нават назвы вуліц адпаведныя: Зялёная, Садовая, Зарэчная… Праўда, прыгожа?

Асаблівае замілаванне выклікае ў мяне вясковая раніца. Я люблю, калі ўдалечыні чуецца мычанне кароў, кудахтанне нясушак і гагатанне гусей. Бязмежнае пачуццё захаплення выклікаюць абмытыя расой кветкі, каля якіх без стомы раяцца мелкія насякомыя і гудуць пчолы. Мне здаецца, што толькі ў гэтым дзіўным кутку нашай велізарнай краіны такое крыштальна чыстае паветра, такая буйная алмазная раса, такое буйства кветак. Мая вёска чароўная заўсёды. Любая пара года знаходзіць тут сваё ўвасабленне. Зіма ахутвае яе снягамі, хлешча вятрамі і скоўвае моцнымі марозамі. Вясна

адорвае цяплом, паўнаводдзем і трэлямі птушак. Лета ж урываецца ў вёску водарам кветак, скошанай травы. А восень шчодра частуе спелымі пладамі і ягадамі, ціха шалясціць дываном з апаўшага лісця.Чароўна!

Але ёсць у гісторыі маёй вёскі і вельмі сумныя старонкі. Вялікая Айчынная вайна на тры гады спыніла мірную стваральную працу жыхароў Смаліцы. Акаляючыя вёску вялізныя лясы сталі тэрыторыямі актыўнага партызанскага супраціўлення фашысцкім захопнікам. Тут адбываліся цяжкія баі партызан супраць акупантаў. У партызанскіх баях і на франтах загінула 65 землякоў. У памяць аб іх каля мясцовага Дома культуры ўзведзены абеліск.Так, час быў вельмі жахлівы. Пачынаеш разумець, якое гэта шчасце - мірнае неба, празрыстае паветра, чыстая вада… Шчасце… Я не вельмі разумею ў свае дванаццаць год  значэнне гэтага слова, але я адчуваю сябе шчаслівай. Асабліва калі бачу , як мая вёска з кожным годам прыгажэе. Зараз гэта ўжо аграгарадок - добраўпарадкаваны населены пункт, які сумяшчае рысы гарадскога жыцця і ўклад  сельскага жыхара. У ім створаны ўсе ўмовы для камфортнага пражывання: функцыянуе стаматалагічны кабінет, маецца аддзяленне паштовай сувязі, тры крамы і многае іншае. Усё гэта сведчыць аб тым, што мая вёска ідзе па шляху аднаўлення і росквіту. Спадзяюся, што мае дзеці будуць з такой жа гордасцю і захапленнем расказваць аб сваёй вёсцы, як і іх маці.

Мая вёска - адна з лепшых беларускіх вёсак, бо менавіта тут затрымліваюцца промні заходзячага сонца. Менавіта  ў маю вёску спяшаецца світанак, бо яго так самаааддана завуць пеўні. Толькі тут так бурна кіпіць простае вясковае жыццё. Для мяне мая вёска вельмі дарагая і я люблю яе такой, якая яна ёсць. Гэта мая вёска, мой край,мая зямля!

Мабыць, вёскі ёсць і прыгажэй,
Гарады, пасёлкі…і сталіцы,
Але сэрцу ўсё ж майму бліжэй
Не яны, а родная Смаліца.
Вы прабачце, Гомель, Віцебск, Брэст
І другі куточак Беларусі,
Люба мне Смаліца, а не вы,
Я да вас ніколі не вярнуся.
Бо куды б мяне ні завяла
Доўгая дарога-чараўніца,
Будзе мроіцца заўсёды ў снах
Дарагая, родная Смаліца.

Василькова Валерия, ГУО «Смолицкая средняя школа»
Быховского района, 6 класс